Н.Я. Петушко,
выкладчык Беларускага універсітэта культуры

# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ У ПЕРЫЯД ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ — ВАЖНЫ ФАКТАР ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Сучасныя патрабаванні да ўзроўню навучання ў вышэйшай школе выклікаюць неабходнасць пошуку эфектыўных напрамкаў фарміравання прафесійных якасцей бібліятэчных спецыялістаў. Адзін з такіх напрамкаў прадугледжвае цеснае спалучэнне працэсу навучання з вытворчай практыкай, які дазваляе пераўтварыць увесь вучэбна-выхаваўчы працэс ва універсітэце ў сапраўднае навуковае даследаванне.

Для студэнта вытворчая практыка — гэта не толькі працэс прымянення тэарэтычных ведаў ва ўмовах бібліятэчнай дзейнасці, фарміраванне прафесійных ведаў, уменняў, але і працэс авалодвання метадамі навуковых даследаванняў, прыёмамі навуковага пошуку і навыкамі аналізу і абагульнення.

Сістэматычныя назіранні выкладчыкаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм і бібліятэчных работнікаў сведчаць аб тым, што характар і інтэнсіўнасць працэсу адаптацыі будучых спецыялістаў залежаць у першую чаргу ад ступені іх удзелу ў навукова-даследчай рабоце на працягу ўсяго навучання ва універсітэце. Студэнты, якія не прымалі ўдзел у навуковых даследаваннях, потым, як правіла, у сваёй непасрэднай прафесійнай дзейнасці часта кіруюцца стэрэатыпным падыходам да працы. Улічваючы гэта, спецыяльныя кафедры плануюць вытворчае навучанне такім чынам, каб з першых дзён праходжання практыкі актыўна далучаць студэнтаў да творчай і навукова-даследчай работы праз:

— заданні, якія звязаны з навукова-даследчай работай выкладчыкаў кафедры. Гэта дазваляе, па-першае, арганізаваць сумесную дзейнасць выкладчыка і студэнта на падставе вырашэння найбольш актуальных навуковых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэказнаўчых праблем. Па-другое, студэнт асэнсоўвае сваё дачыненне да даследавання, яго вынікаў;

— практычныя заданні, якія патрабуюць ад студэнтаў самастойнага і творчага падыходу да іх выканання. Гэтыя заданні розныя па сваім змесце, але кожнае патрабуе ўмення аналізаваць, параўноўваць, рабіць вынікі, уносіць канкрэтныя прапановы па ўдасканальванні тых ці іншых напрамкаў работы бібліятэк. Напрыклад, па курсе "Абслугоўванне карыстальнікаў" праграмнымі заданнямі прадугледжваецца непасрэдны ўдзел студэнтаў у даследаваннях, якія праводзіць бібліятэка па вывучэнні чытача і чытання, выкарыстоўваючы розныя навукова-даследчыя метады (апытанне, аналіз бібліятэчнай дакументацыі і інш.), іх аналіз і абагульненне атрыманага матэрыялу і на падставе вынікаў распрацоўка прапаноў (рэкамендацый) па паляпшэнні працэсаў абслугоўвання;

— збор і выкарыстанне матэрыялаў практыкі для курсавых і дыпломных праектаў. Гэты від навукова-даследчай работы патрабуе ад студэнтаў абгрунтавання тэмы з улікам актуальных задач, якія стаяць перад бібліятэкамі, паглыбленай распрацоўкі тэарэтычнай часткі на падставе шырокага кола літаратуры і сувязі з практыкай бібліятэчнай работы, аналізу стану таго або іншага напрамку бібліятэчнай дзейнасці ў параўнанні з тым, як вырашаецца праблема ў тэорыі, правядзення невялікага даследавання (назірання, эксперымента), вывучэння дакументаў з абавязковымі вынікамі і прапановамі студэнта па яе аптымізацыі.

Безумоўна, названыя вышэй напрамкі навукова-даследчай работы студэнтаў у перыяд вытворчай практыкі не з'яўляюцца вычарпальнымі. Найбольш цікавыя абмяркоўваюцца на штогадовых кафедральных, міжкафедральных і факультэцкіх студэнцкіх навуковых канферэнцыях, уваходзяць у дысертацыйнае даследаванне магістра ці аспіранта.

Такім чынам, вытворчая практыка садзейнічае выяўленню пазнавальных і творчых здольнасцей студэнтаў, падрыхтоўвае іх да шматграннай навукова-даследчай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ